**У Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры адбылося новае сцэнічнае ўвасабленне балета “Мефіста” (разбуральнік душ) на музыку Уладзіміра Кандрусевіча.**


Віталь Краснаглазаў (Мефіста), Рына Івакіры (Марго), Рыгор Крукоўскі (Юнак).

# Балет заўсёды болей, чым балет...

Назва балета, упершыню ўвасобленага харэографам Уладзімірам Івановым у 2002 годзе, можа ўвесці гледача ў зман. Ці не з'яўляецца імя Мефіста (Віталь Краснаглазаў) скарачэннем ад Мефістофеля, героя “Фаўста” Гётэ? Ці не чакае нас сустрэча з балетным варыянтам трагедыі? Сапраўды, імёны герояў часткова ўзяты з класікі: “Мефіста” на старажытнаяўрэйскай мове і значыць Мефістофель — разбуральнік, падманшчык; Фаўст у першай версіі балетаператварыўся ў Фа (цяпер персанаж з'яўляецца Юнаком — Рыгор Крукоўскі), яго каханая Маргарыта — у Марго (Рына Івакіры). У нечым падобны і сюжэт: калі Фаўст у аднайменнай трагедыі прагнуў дасягнуць вечнай маладосці і таму заключыў дамову з Мефістофелем, сімвалам цемры, дык Юнака штурхае на такі ўчынак каханне.

Але механічнага пераносу няма. Таму мае рацыю Юлія Чурко, адзін з аўтараў лібрэта (напісанага разам з У.Івановым), лічачы, што “выкарыстанне класічных матываў спатрэбілася аўтарам для таго, каб падкрэсліць вечнасць праблемы: душы людзей прадаюцца ва ўсе часы”.

У параўнанні з папярэдняй версіяй істотна змянілася канцэпцыя балета. Паводле слоў саміх стваральнікаў, “Мефіста” ператварыўся з неакласікі ў сучасны балет. Якімі сродкамі гэта дасягнута?

Без перабольшвання львіную долю поспеху павінны падзяліць паміж сабой кампазітар і балетмайстар. Музыка Кандрусевіча — то дынамічна-драматычная, то трапяткая і ўзнёслая, ідэальна створаная для харэаграфіі, руху і дзеяння — нарадзіла фантастычнае адчуванне палёту, своеасаблівай музычнай нірваны. Прычым кампазітар істотна перапрацаваў свой твор. З выкарыстаннем новай тэхнікі быў напісаны пралог. Што датычыцца музычнай вакханаліі ў другой дзеі, якая вырашалася праз выкарыстанне шумавых эфектаў, дык яна ў нечым нагадвала булгакаўскі баль у Воланда і абсалютна ўпісалася ў агульную стылістыку спектакля.

На якасна новы ўзровень выйшаў Уладзімір Іваноў. У мінулым адзін з лепшых беларускіх танцоўшчыкаў, народны артыст Беларусі, ён як харэограф не мог пахваліцца значнай увагай тэатраў да сваёй асобы. Таму “Мефіста” стаў для яго ўсяго другой паўнавартаснай пастаноўкай. Першай, нагадаю, з'яўлялася “Кругаверць”, пастаўленая яшчэ ў 1995-м разам з Юліяй Чурко на сцэне тэатра оперы і балета. Але калі ў тым балеце Іваноў выступаў пачаткоўцам, дык зараз ён вырас у глыбокага майстра са сваім адметным почыркам.

Сцэнаграфія Дзмітрыя Мохава, прадстаўленая канструкцыяй, якая нагадвае верталёт — сродак перамяшчэння Мефіста і Марго; фантастычнае мроіва, што стварае ўражанне пекла, — усё гэта ў параўнанні з мінулай версіяй балета засталося нязменным. Дабавілася хіба толькі кінапраекцыя на экран, якая ў першых сцэнах балета дазволіла больш дакладна ахарактарызаваць Мефіста.

У новай версіі істотна змяніўся сюжэт. Стваральнікі спектакля адмовіліся ад прафесій герояў (у мінулай пастаноўцы Мефіста з'яўляўся бізнесменам, Фа — доктарам-хірургам, а Марго — супермадэллю), што дазволіла гледачам самім інтэрпрэтаваць паводзіны герояў і шукаць іх падабенства з тымі ці іншымі катэгорыямі людзей. У якасці кантрасту да Марго дабавілася светлая Дзяўчына (Настасся Красоўская), з якой Юнака яднаці рамантычныя пачуцці.

Істотна пашырыўся эмацыянальны і сэнсавы дыяпазон вобраза галоўнага героя. Віталь Краснаглазаў, адзін з лепшых салістаў трупы тэатра, заўжды паспяхова танцаваў класіку (Дэзірэ, Альберт, Прынц-Шчаўкунчык, Базіль), умеў надаць сваім героям фарбы экспрэсіўнасці (Джыну ў “Шахерызадзе”) камічнасці (“In pivo veritas”) і лірызму (Юнак у “Шапеніяне”, Ружа ў “Балі кветак”). Але партыя Мефіста, безумоўна, стала лепшай у яго рэпертуары. Разбэшчанасць і брутальнасць, жорсткасць і бессардэчнасць, сарданічная ўсмешка і пагарда да ўсяго шчырага — з такімі якасцямі паўстае яго герой.

Наогул, усе выканаўцы ў “Мефіста” перасягнулі саміх сябе. Пастаноўка “Мефіста” зрабілася безумоўным творчым поспехам музычнага тэатра і найбольш яркім балетам апошняга дзесяцігоддзя. Менавіта такія спектаклі могуць і павінны станавіцца візітоўкай сучаснага айчыннага мастацтва, трапляць на прэстыжныя міжнародныя харэаграфічныя фестывалі.

**Дзяніс МАРЦІНОВІЧ.**
**Фота Ігара КУЗНЯЦОВА.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ